**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па гуманітарнай адукацыі**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________ А. І. Жук
14.06.2013
Рэгістрацыйны № ТД-Е.508/тып.

# ПРАФЕСІЙНАЕ МАЙСТЭРСТВА

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для ўстаноў вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці:**

**1-23 01 10-01 «Літаратурная работа (творчасць)»**

**УЗГОДНЕНА**
Першы намеснік
міністра інфармацыі
Рэспублікі Беларусь
________ Л.С. Ананіч
25.10.2012

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Упраўлення вышэйшай
адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________ С.І. Раманюк
14.06.2013

Старшыня Вучэбна-
метадычнага аб'яднання
па гуманітарнай адукацыі
________ А.В. Данільчанка
22.10.2012

Прарэктар па навукова-
метадычнай рабоце
Дзяржаўнай установы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай
школы»
________ І. У. Цітовіч
29.05.2013

Эксперт-нормакантралёр
________ Л.Т. Парфенцова
29.05.2013

**Мінск 2013**

**СКЛАДАЛЬНІК:**
*Галіна Барысаўна Багданава,* дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Кафедра беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»;

*Заяц Наталля Віктараўна,* кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка".

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 1 ад 31.08.2012 г.)

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 1 ад 27.09.2012 г.)

Навукова-метадычным саветам па журналістыцы Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі
(пратакол № 1 ад 12.10.2012 г.)

Адказны за рэдакцыю: Г.Б. Багданава
Адказны за выпуск: Г.Б. Багданава

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Прафесійнае майстэрства» ўваходзіць у цыкл агульпрафесійных і спецыяльных дысцыплін па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 10-01 «Літаратурная работа (творчасць)».

Пры правядзенні заняткаў студэнты набываюць прафесійныя навыкі па напісанню мастацкіх твораў, абапіраючыся на класічныя ўзоры замежнай і беларускай літаратуры, вучацца пераўтвараць жыццёвыя падзеі ў мастацкія вобразы, выпрацоўваюць свой уласны аўтарскі стыль.

Курс мае непасрэдную **сувязь з такімі дысцыплінамі**, як «Руская літаратура», «Беларуская літаратура», «Асновы тэорыі літаратуры», «Стылістыка».

Праграма мае дастасоўны характар і акцэнтуе ўвагу студэнтаў на асновах літаратурнай творчасці.

Выкладанне вучэбнай дсцыпліны мае на **мэце** пазнаёміць студэнтаў са спецыфікай розных відаў, родаў, жанраў літаратурна-мастацкай творчасці, з асноўнымі літаратурнымі стылямі, асаблівасцямі напісання літаратурных твораў, з асновамі псіхалогіі творчасці, з прафесійным вопытам розных пісьменнікаў, з тэхналогіяй стварэння мастацкіх вобразаў, выявіць схільнасці і асаблівасці творчай манеры кожнага студэнта.

Таму **задачамі** дысцыпліны з'яўляюцца:

– пазнаёміць студэнтаў з асаблівасцямі працы над літаратурнымі творамі розных відаў, родаў, жанраў;

– даць уяўленне пра асноўныя літаратурныя стылі;

– навучыць студэнтаў не толькі глядзець, але і бачыць, прафесійна пераўвасабляць жыццёвыя падзеі ў мастацкія вобразы;

– пазнаёміць з асноўнымі тэмамі літаратуры, законамі арганізацыі кампазіцыі і развіцця сюжэта;

– выпрацаваць свой уласны аўтарскі стыль.

Студэнт павінен ***ведаць:***

- асаблівасці стварэння паэтычнага твора;
- законы пабудовы празаічнага твора;
- адметныя асаблівасці аўтарскіх стыляў;
- сучасныя тэндэнцыі ў развіцці літаратурнай творчасці;
- асаблівасці напісання кінасцэнарыяў у розных відах кінамастацтва;
- асаблівасці аўтарскага стылю ў кінадраматургічнай творчасці;
- сімбіёз экраннага мастацтва і літаратурнай творчасці ў кінадраматургіі;
- асаблівасці прадстаўлення твораў мастацтва ў друкаваных СМІ;
- спецыфіку асвятлення праблем культуры ў аўдыявізуальных СМІ;
- жанравыя асаблівасці літаратурна-мастацкай крытыкі;
- заканамернасці прадстаўлення твораў мастацтва ў масавых і спецыялізаваных СМІ;
- сутнасць мастацкай цэласнасці твораў мастацтва.

Студэнт павінен ***умець:***

- ствараць уласныя паэтычныя творы;
- ствараць уласныя празаічныя творы;
- выпрацоўваць індывідуальны стыль ў літаратурнай творчасці;
- ствараць кінасцэнарыі ў розных відах кінамастацтву;
- ствараць літаратурную аснову для тэатральных пастановак;
- рэдагаваць творы кіна- і тэатральнага мастацтва;
- прадстаўляць творы мастацтва ў масавых і спецыялізаваных СМІ;
- адрозніваць жанравыя асаблівасці літаратурна-крытычнай дзейнасці.

Асноўнымі **метадамі і тэхналогіямі,** што выкарыстоўваюцца падчас вывучэння дысцыпліны, з'яўляюцца:

– сістэма аналогій (выпрацоўка ўласнага стылю ў супастаўленні са стылем класічнага твора або твораў);

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, вучэбныя дэбаты);

– гульнёвыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты вучацца ставіць сябе на месца сваіх герoеў;

– метад работы ў малых групах ("французскія майстэрні");

– самастойная праца.

**Патрабаванні да арганізацыі кантраляванай самастойнай работы:** вядзенне літаратурнага дзённіка, напісанне ўласных твораў на дадзеную або самастойна абраную тэму.

Аналіз твораў замежных і айчынных аўтараў, напісаных ў розных жанрах (індывідуальна і ў групах). Студэнты потым праігрываюць прапанаваныя сюжэты, пішуць свае творы на зададзеную або самастойна прапанаваную тэму .

Канчатковай формай кантролю ведаў з'яўляецца залік. Пры выстаўленні заліку ўлічваецца наведванне лабараторных заняткаў, выкананне творчых заданняў і выяўленне творчай актыўнасці.

На вывучэнне дысцыпліны «Прафесійнае майстэрства» ў адпаведнасці з тыпавым планам напрамку спецыяльнасці 1-23 01 10-01 «Літаратурная работа (творчасць)» адводзіцца 152 гадзіны, з іх – 88 аўдыторных (лабараторныя заняткі).

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ПРАФЕСІЙНАЕ МАЙСТЭРСТВА

| № п/п | Найменне раздзелаў, тэм | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | у тым ліку | |
| | | | лекцыі | лаб. заняткі |
| **Раздзел 1. Літаратурны твор як унікальная з'ява культуры.** | | | | |
| 1.1. | Асноўныя віды і роды літаратурна-мастацкай творчасці. Асаблівасці напісання твораў | | | 4 |
| 1.2. | Асноўныя літаратурныя жанры. Асаблівасці напісання літаратурных твораў у розных жанрах | | | 4 |
| 1.3. | Асноўныя літаратурна-мастацкія стылі | | | 4 |
| 1.4. | Тэма, сюжэт, кампазіцыя | | | 2 |
| 1.5. | Тэхналогія стварэння мастацкага вобраза | | | 4 |
| 1.6. | Стылявыя дамінанты і суб'ектыўная арганізацыя мовы | | | 2 |
| 1.7. | Выпрацоўка ўласнага стылю | | | 2 |
| 1.8. | Напісанне мастацкага твора на зададзеную тэму | | | 4 |
| 1.9. | Напісанне мастацкага твора на адвольную тэму | | | 4 |
| **Раздзел 2. Герой мастацкага твора. Вобраз рэальны і ўяўны.** | | | | |
| 2.1. | Вобраз галоўнага героя ў класічнай і сучаснай літаратуры | | | 4 |
| 2.2. | Стварэнне вобраза героя. Мастацкая дэталь | | | 6 |
| 2.3. | Імя героя. Знешняя характарыстыка і характар | | | 4 |
| 2.4. | Мова героя і яе значэнне для раскрыцця вобраза. Майстэрства дыялогу | | | 6 |
| 2.5. | Персанаж у інтэр'еры і экстэр'еры. Сувязь героя з прыродай і соцыумам | | | 4 |
| 2.6. | Лірычны герой | | | 2 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2.7. | Герой у розных родах і жанрах літаратуры | | | 4 |
| **Раздзел 3. Сюжэт і яго вобразнае ўвасабленне.** | | | | |
| 3.1. | Найбольш папулярныя ў літаратуры сюжэты. Сюжэт і назва | | | 6 |
| 3.2. | Напісанне ўласнага літаратурнага твора на адзін з папулярных сюжэтаў | | | 6 |
| 3.3. | Фальклорныя сюжэты. Архетыпы і іх пераасэнсаванне ў літаратуры | | | 6 |
| 3.4. | Напісанне ўласнага літаратурнага твору з фальклорным (казачным) сюжэтам | | | 6 |
| 3.5. | Як напісаць дэтэктыў | | | 2 |
| 3.6. | Напісанне ўласнага твору з дэтэктыўным сюжэтам | | | 2 |
| | **УСЯГО :** | **88** | | **88** |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

## Раздзел 1. Літаратурны твор як унікальная з'ява культуры.

### Тэма 1.1. Асноўныя віды і роды літаратурна-мастацкай творчасці. Асаблівасці напісання літаратурных твораў

Віды літаратурна-масатацкай творчасці гэта найперш яе тыпы: паэзія і проза.

Паэзія як спецыфічны тып літаратурна-мастацкй творчасці, які абсалютызуе станы душы, спыняе імгненні (на прыкладзе вершаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Леаніда Дранько-Майсюка альбо іншых аўтараў на выбар).

Проза як спецыфічны тып літаратурна-мастацкай творчасці, які разгортвае імгненні ў падзеі і выстройвае іх у канцэптуальны парадак (на прыкладзе апавяданняў Якуба Коласа, Івана Пташнікава, Андрэя Федарэнкі альбо іншых аўтараў на выбар).

Асаблівасці асноўных родаў літаратурна-мастацкай творчасці – эпічнага (раман, аповесць, апавяданне, навела), лірычнага (песня, гімн, эпіграма, дыфірамб, ода, эпітафія, раманс), драматычнага (трагедыя, камедыя, драма) на прыкладзе літаратурных твораў на выбар. Ліра-эпічныя жанры (паэма, балада).

Народны эпас (балада, быліна, гістарычная песня, дума, казка, паданне, эпапея).

Пры аналізе класічных твораў літаратуры робіцца акцэнт на асаблівасці напісання літаратурных твораў пэўнага віду і роду літаратурна-мастацкай творчасці.

### Тэма 1.2. Асноўныя літаратурныя жанры. Асаблівасці напісання літаратурных твораў у розных жанрах

На прыкладзе канкрэтных класічных твораў (на выбар) разглядаюцца асаблівасці напісання твораў у розных жанрах.

Асаблівасці напісання рамана, аповесці, апавядання, навелы ( раман І.Мележа "Людзі на балоце", аповесць В.Быкава "Сотнікаў", апавяданне І.Пташнікава "Ільвы", навелы Бакача і г.д. або іншыя творы на выбар).

Асаблівасці напісання верша, песні, гімна, эпіграмы, дыфірамба, оды, эпітафіі, раманса, паэмы, балады (на выбар).

Асаблівасці напісання трагедыі, камедыі, драмы (на выбар).

### Тэма 1.3. Асноўныя літаратурна-мастацкія стылі

Аналіз твораў розных стыляў (творы на выбар).

Эпоха рэнесансу (Адраджэнне). Гуманізм. Навелы Бакача. Сервантэс, Рабле

і ішыя аўтары.

Барока.Паліфанізм.

Класіцызм. Арыентаванасць на антычнасць.

Асветніцтва. Ідэя падначальвае героеў. Дэфо, Русо і іншыя аўтары.

Рамантызм. Галоўнае – чалавечыя пачуцці. Байран, Гюго і іншыя аўтары.

Рэалізм. Галоўнае—рэальнае ўвасабленне падзей у іх натуральным развіцці. Бальзак, Хемінгуэй, Фолкнер, Л.Талстой, Ф.Дастаеўскі, Я.Колас і іншыя.

Мадэрнізм. Творы вылучаюцца ўпэўненасцю ў глыбокім, непераадольным разыходжанні духоўнага вопыту чаалвека і асноўнай тэндэнцыяй развіцця грамадства, адчуваннем адзіноты, адчужанасці чалавека, стратай ідэалаў (творы Бекета, Джойса, Камю, Пруста і іншых)

Постмадэрнізм як феномен сучаснай літаратуры. Выкарыстанне вобразаў з розных эпох і стыляў. Шматадраснасць. Інтэртэкстуальнасць. Умбэрта Эка "Імя ружы", Набокаў, Каэлья, Павіч, У. Сцяпан, Танк, Разанаў і іншыя аўтары.

**Тэма 1.4. Тэма, сюжэт, кампазіцыя**

На прыкладзе канкрэтных твораў (на выбар) разглядаюцца тэма (што пакладзена ў аснову), ідэя, сюжэт (сістэма дзеянняў у творы). Розніца паміж сюжэтамі эпічных, лірычных, драматычных твораў.

Сюжэт эпічных твораў спалучае знешнія (фабульныя) і ўнутраныя (псіхалагічныя) сувязі. Пераважае адзін пэўны тып сюжэта, які дыктуецца індывідуальным аўтарскім стылем. Адметнасць сюжэта тлумачыцца інтэнгсіўнасцю дзеяння.

Сюжэт лірычных твораў ствараецца плынню перажыванняў, настрояў лірычнага героя.

Асаблівасці сюжэта драматычных твораў.

Новы змест старых сюжэтаў.

Кампазіцыя – арганізацыя літаратурнага твора, спосаб увасаблення мастацкай ідэі, раскрыцця характараў.

На прыкладзе канкрэтных твораў ( на выбар) разглядаюцца асобныя элементы кампазіцыі – экспазіцыя (пралог), завязка (развіццё дзеяння), кульмінацыя, развязка, пралог.

Канкрэтнымі прыкладамі ілюструюцца храналагічна паслядоўны (прамы), рэтраспектыўны (інверсійны) кірунак дзеяння.

Асаблівасці лірычнай кампазіцыі ў лірыцы (размеркаванне рытміка-меладычных адпаведнікаў, радкоў, строф).

Падтэкст. Фабула (падзейная схема сюжэта).

**Тэма 1.5. Тэхналогія стварэння мастацкага вобраза**

Мастацкі вобраз як спосаб і форма адлюстравання свету ў мастацтве, катэгорыя мастацкай дзейнасці. Мастацкі вобраз і яго канкрэтна-пачуццёвая форма. Абагульненне канкрэтнага. Адзінкавая з'ява паўстае як

асаблівая і ўсеагульная. Цэласнасць абагульнення. Рацыянальны пачатак у еднасці з эмацыянальным.
На прыкладзе канкрэтных літаратурных твораў ( на выбар) разглядаецца тэхналогія стварэння мастацкага вобраза.

**Тэма 1.6. Стылявыя дамінанты і суб'ектыўная арганізацыя мовы**

На прыкладзе канкрэтных твораў (на выбар) разглядаюцца стылявыя дамінанты ў сюжэце, сітуацыі, адзначаюцца прадметная і псіхалагічная дэталі.
Вызначаюцца суб'ектыўныя асаблівасці арганізацыі мовы асобных аўтараў (на выбар) – А.Чэхаў, Ул.Набокаў, М. Булгакаў, І.Мележ, Ул.Караткевіч, А.Федарэнка, А.Вазнясенскі, С. Рублеўскі, В.Шэкспір, А.Дудараў і інш.

**Тэма 1.7. Выпрацоўка ўласнага стылю**

Творчая праца па сістэме "аналогій". На пачатку семестра кожны выбірае па адным паэтычным і празаічным творы рускага і беларускага аўтара (усяго 4 творы) і, уважліва чытаючы іх, выпісвае ў мастацкі дзённік тыя фразы, урыўкі, вобразы, словы, якія найбольш уразілі.
На занятках кожны ставрае штрыхі да партрэту стыля абранага аўтара.
Для працы па сістэме аналогій прапануюцца: І.Мележ."Людзі на балоце", М.Булгакаў "Майстар і Маргарыта", Яўг.Еўтушэнка (паэзія), Л.Дранько-Майсюк (паэзія) або іншыя творы на выбар.

**Тэма 1.8. Напісанне мастацкага твору на зададзеную тэму**

Для напісання твору прапануюцца такія класічныя тэмы, як нарадэнне, каханне, смерць.
Напісаныя творы аналізуюцца.

**Тэма 1.9. Напісанне мастацкага твору на адвольную тэму**

Кожны са студэнтаў піша твор на самастойна абраную тэму. Творы аналізуюцца.

**Раздзел 2. Герой мастацкага твора. Вобраз рэальны і ўяўны.**

**Тэма 2.1. Вобраз галоўнага героя ў класічнай і сучаснай літаратуры**

Галоўны герой літаратурнага твора і яго роля ў агульным мастацкім кантэксце.
Героі фальклорных твораў. Героі антычнай літаратуры. Героі ў летапісах. Героі літаратуры Новага часу. 17-18 стагоддзі.
Герой у літаратуры 19 стагоддзя. Класіцызм, рамантызм і іх уплыў на вобраз галоўнага героя (На прыкладзе твораў Мальера, Гюго і іншых).

вобраз галоўнага героя (На прыкладзе твораў Мальера, Гюго і іншых).
Роля героя ў літаратуры рэалізму (на прыкладзе твораў Бальзака, Дастаеўскага, Талстога, Шолахава, Коласа, Мележа і іншых).
Герой у літаратуры мадэрнізму (на прыкладзе твораў Джойса, Кафкі, Пруста. Сартра і іншых).
Герой у постмадэрнісцкай літаратуры (на прыкладзе твораў Павіча, Умберта Эка, Куэльё і іншых).
Герой у сучаснай беларускай літаратуры .
Выкананне творчага пісьмовага задання (стылізацыі). "Я --герой твора 1.антычнай літаратуры; 2.народнай казкі; 3. твора эпохі рамантызму; 4. твора рэалізму (сацыялістычнага рэалізму); 5. мадэрнісцкага твору; 6. постмадэрнісцкага твору". Творы аналізуюцца.

**Тэма 2.2. Стварэнне вобраза героя. Мастацкая дэталь**

Герой рэальны і ўяўны. Ад прататыпа да вобраза. Тыпізацыя. Мастацкая дэталь і яе роля ў раскрыцці вобраза героя. Прадметная і псіхалагічная дэталь. Выкананне практычных заданняў на тэмы "Мой сябра", "Выпадковы спадарожнік", "Аўтапартрэт", "Мой партрэт у нацюрморце" і іншых. Творы аналізуюцца.

**Тэма 2.3. Імя героя. Знешняя характарыстыка і характар**

Супастаўленне імёнаў герояў і іх характараў на прыкладзе твораў класічнай і сучаснай літаратуры (на выбар). Аналіз знешняй характарыстыкі і характару герояў класічных і сучасных твораў (на выбар). Стварэнне вобраза героя і антыгероя (самастойнае пісьмовае заданне). Творы аналізуюцца.

**Тэма 2.4. Мова героя і яе значэнне для раскрыцця вобраза. Майстэрства дыялогу**

Аналіз мовы герое́ў класічных і сучасных літаратурных твораў (на выбар).
Роля дыялогу ў прозе, паэзіі, драматургіі.
Вусны і пісьмовы дыялог. Літаратурная апрацоўка.
Выкананне вусных і пісьмовых заданняў на тэмы "Дыялог з уласным ценем", "Дыялог з Фрэйдам (або іншым памерлым аўтарам)", "Дыялог з выпадковым знаёмым (знаёмай)" і г.д. Творы аналізуюцца.

**Тэма 2.5. Персанаж у інтэр'еры і экстэр'еры. Сувязь героя з прыродай і соцыумам**

Як герой суадносіцца з інтэр'ерам і экстэр'ерам (на прыкладзе "Мертвых душаў" Гогаля, "Вайны і міра" Талстога, "Людзей на балоце" Мележа і іншых твораў класічнай і сучаснай літаратуры). Аналіз, супастаўленне.
Выкананне самастойнага пісьмовага творчага задання на тэму "Я і мой пакой", "Дом байкера", "Дом Барбі", "Сад маёй бабулі" і інш.
Прырода і яе роля ў раскрыцці вобразаў герое́ў. Соцыум і ягоны ўплыў на вобразы літаратурных герое́ў у розныя эпохі (самастойны аналіз на

прыкладзе твораў).
Выкананне самастойнага творчага задання “Мой лес”, “Я сустракаю сонца”, “У інтэрнаце”, “На стадыёне” і г.д. Творы аналізуюцца.

**Тэма 2.6. Лірычны герой**

Лірычны герой у прозе і паэзіі ( на прыкладзе літаратурных твораў).
Стварэнне вобраза лірычнага героя. Выкананне пісьмовага творчага задання на адну з тэм “Я і мой лірычны герой”, “Лірычны герой майго сябра”, “Лірычны герой майго бацькі” і інш.

**Тэма 2.7. Герой у розных родах і жанрах літаратуры**

На прыкладзе канкрэтных твораў праводзіцца самастойная класіфікацыя, даюцца характарыстыкі, адзначаюцца асаблівасці ўвасаблення героеў у розных родах і жанрах літаратуры (пісьмовае заданне).
Выконваецца самастойнае пісьмовае заданне (напіанне мастацкага твора на тэму “Герой нашага часу” (род і жанр на выбар аўтара)). Творы аналізуюцца.

## Раздзел 3. Сюжэт і яго вобразнае ўвасабленне.

**Тэма 3.1. Найбольш папулярныя ў літаратуры сюжэты. Сюжэт і назва**

Ад сітуацыі да сюжэта. Назва мастацкага твора і яе суадносіны з сюжэтам. Самастойны падбор твораў на класічныя сюжэты – падарожжа, пераблытаныя прадметы, блізняты, пераапрананні, трохкутнік і г.д. 16 або 36 агульнавядомых сюжэтаў?
Аналіз назваў мастацкіх твораў і іх суаднесенасць да сюжэтаў.
Нараджэнне, каханне, смерць і іх пераасэнсаванне ў мастацкіх творах.
Творчае заданне – “Назва майго будучага рамана” ( 7 варыянтаў назвы для аднаго сюжэта).

**Тэма 3.2. Напісанне ўласнага літаратурнага твора на адзін з папулярных сюжэтаў**

Спачатку ўсе пішуць невялікую навелу на адзін з прапанаваных сюжэтаў. Напрыклад, “Падарожжа”. Потым кожны сам выбірае адзін з найбольш папулярных сюжэтаў і піша мастацкі твор. Творы аналізуюцца.

**Тэма 3.3. Фальклорныя сюжэты. Архетыпы і іх пераасэнсаванне ў літаратуры**

Студэнты самастойна вылучаюць з фальклорных твораў архетыповыя сюжэты і вобразы.

**Тэма 3.4. Напісанне ўласнага літаратурнага твору з фальклорным (казачным) сюжэтам**

Спачатку ўсе пішуць масатцкія творы на тэму “Сусветнае дрэва” ( з тэмай “нараджэнне, каханне, смерць”). Потым кожны піша мастацкі твор з фальклорным (казачным) сюжэтам. Творы аналізуюцца.

**Тэма 3.5. Як напісаць дэтэктыў**

Знаёмства з асаблівасцямі дэтэктыўнага жанру. К.Дойл, А.Крысці, сучасныя майстры дэтэктыву. Сюжэт, інтрыга. Серыі дэтэктываў.

Выкананне творчага задання. Напісанне дэтэктыву ў працяг прачытанаму ўсім пачатку. Назву кожны дае сваю. Творы аналізуюцца.

**Тэма 3.6. Напісанне ўласнага твору с дэтэктыўным сюжэтам**

Кожны піша дэтэктыўны твор з дэтэктыўным сюжэтам. Творы аналізуюцца.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Рэкамендаваная літаратура

### Асноўная

1.Лосев А.Ф. Проблема художественного стиля. Киев, 1994.
2. Каваленка В.А., Мушынскі М.І., Яскевіч А.С. Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы. Мн., 1972 .
3. Макарэвіч А.М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пач.XX ст. Магілёў, 1999.
4.Пяткевіч А. Сюжэт. Кампазіцыя. Характар. Мн., 1981.

### Дадатковая

1.Беларуская савецкая проза: апавяданне і нарыс. Мн., 1971.
2.Беларуская савецкая проза: Раман і аповесць. Мн., 1971.
3. Как сделать детектив. М.,1990.
4.Лосев А.Ф. Форма-Стиль-Выражение. М.,1995.
5.Соколов А.Н. Теория стиля. М., 1968.
6. Стыль пісьменніка. Мн., 1974.

## Прыкладныя пытанні да курса

1. Асноўныя віды літаратурна-мастацкай творчасці.
2. Асаблівасці паэзіі як віда літаратурна-мастацкай творчасці.
3. Асаблівасці прозы як віда літаратурна-масатцкай творчасці.
4. Асноўныя роды літаратурна-мастацкай творчасці.
5. Асаблівасці эпасу.
6. Асабілвасці лірыкі.
7. Асаблівасці драмы.
8. Асноўныя літаратурныя жанры.
9. Асаблівасці напісання твораў у розных жанрах
10. Асноўныя літаратурна-мастацкія стылі.
11. Тэма літаратурнага твора.
12. Законы развіцця сюжэта ў літаратурным творы.
13. Кампазіцыялітаратурнага твора. Тэхналогія стварэння мастацкага вобраза.
14. Стылявыя дамінанты і суб'ектыўная арганізацыя мовы.
15. Шляхі выпрацоўкі ўласнага стылю.
16. Асаблівасці напісання мастацкага твору на зададзеную тэму.
17. Асаблівасці напісання твору на адвольную тэму.
18. Аналіз аднаго з літаратурных твораў (на выбар).
19. Герой мастацкага твора. Вобраз рэальны і ўяўны.
20. Імя героя. Знешняя характарыстыка і характар.
21. Мова героя і яе значэнне для раскрыцця вобраза. Майстэрства дыялогу
22. Лірычны герой.
23. Вобраз галоўнага героя ў класічнай і сучаснай літаратуры.
24. Стварэнне вобраза героя. Мастацкая дэталь
25. Персанаж у інтэр'еры і экстэр'еры. Сувязь героя з прыродай і соцыумам.
26. Найбольш папулярныя ў літаратуры сюжэты.
27. Фальклорныя сюжэты. Архетыпы і іх пераасэнсаванне ў літаратуры.
28. Як напісаць дэтэктыў.

## Крытэрыі ацэнак вынікаў вучэбнай дзейнасці

Для бягучага кантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца рэйтынгавая сістэма, якая дзейнічае падчас семестра. Прамежкавымі формамі кантролю засваення прадмета з'яўляюцца аналіз журналісцкіх матэрыялаў студэнтаў групы ў вуснай форме, напісанне ўласных матэрыялаў. Дадатковымі крытэрыямі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці можа быць напісанне даследчага праекта, твораў у асноўных літаратурна-крытычных жанрах, журналісцкая праца ў спецыялізаваных СМІ.

Схема ацэнкі ведаў студэнтаў

1. Наведванне студэнтамі заняткаў – 20 балаў.
2. Здача журналісцкіх матэрыялаў і ілюстрацый да іх – 20-60 балаў.
3. Актыўнасць на занятках – 5-20 балаў.

Выніковая ацэнка:

| Колькасць набранных балаў | Выніковая ацэнка |
|---|---|
| Менш за 40 балаў | Нядопуск да заліку |
| Ад 40 да 49 балаў | 4 |
| Ад 50 да 59 балаў | 5 |
| Ад 60 да 69 балаў | 6 |
| Ад 70 да 79 балаў | 7 |
| Ад 80 да 89 балаў | 8 |
| 90 балаў | 9 |
| Ад 90 да 100 балаў | 10 |

## Спіс рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі ведаў

Вынікі вучэбнай дзейнасці студэнта ацэньваюцца ў працэсе падрыхтоўкі ім аўтарскіх матэрыялаў. Рэкамендуюцца наступныя сродкі дыягностыкі ведаў: вусныя апытанні, тэставыя заданні, рэфераты.